Якубінская, А. Дз. Роля мацярынскіх сімвалаў у народнай педыятрыі беларусаў / А. Дз. Якубінская // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. — Минск: БГУ, 2011. — С. 142 – 144

**А. ДЗ. ЯКУБІНСКАЯ**

# РОЛЯ МАЦЯРЫНСКІХ СІМВАЛАЎ У НАРОДНАЙ ПЕДЫЯТРЫІ БЕЛАРУСАЎ

Галоўнай мэтай традыцыйнай сацыялізацыі беларусаў з'яўлялася прыстасаванне дзяцей да здаровага ладу жыцця, а значыць выхаванне паўнавартасных членаў сялянскай грамады. Важнейшую ролю ў гэтым працэсе адыгрывала «народная педыятрыя». Народная педыятрыя – гэта своеасаблівы комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне дасканалага фізічнага і псіхічнага стану дзіцяці, які складаецца з «матчынай гімнастыкі», спецыяльных спосабаў і сродкаў для авалодання тэхнікай цела, а таксама традыцыйных спосабаў і сродкаў прафілактыкі і лячэння дзіцячых хвароб. Традыцыйныя спосабы лячэння дзіцячых хвароб з'яўляюцца найменш даследаваным і вельмі абшырным пластом народнай педыятрыі. У традыцыйных спосабах лячэння дзіцячых хвароб вылучаюцца два накірункі – рацыянальныя сродкі – масаж, лекавыя травы і нерацыянальныя – магічныя сродкі. Вельмі часта гэтыя накірункі спалучаліся. Многія хваробы немаўлят лячыліся пры дапамозе мацярынскіх сімвалаў.

Даволі распаўсюджанай дзіцячай хваробай была хвароба, вядомая пад назвай *«зубішча» (цемяннік)*. Яна суправаджалася пагаршэннем фізічнага стану дзіцяці і была абумоўлена зніжэннем яго імунітэту пад час прарэзвання зубоў. Каб аблегчыць прарэзванне зубоў, скроні дзіцяці змазвалі сумессю матчынага малака з сокам часнаку [4, с. 12]. Пры гэтым малако трэба было «працыркнуць» праз грабеньчык [4, с. 12]. Магчыма, такі народны спосаб мае пэўную рацыю, бо часнок добра вядомы як прыродны антысэптык. У Мядзельскім раёне Мінскай вобласці маці мезенным пальцам левай рукі змазвала дзясны дзіцяці мёдам, давала пагрызці жалезную лыжачку [2, с. 8]. Звычайна лячэнне «зубішча» суправаджалі спецыяльнай замовай. Замову трэба было шаптаць пад дубам ці ля дубовага коліка тры дні запар раніцай на золку ці вечарам на заходзе сонца [4, с. 12]. Такую замову, як «*дымішча, дымішча, вазьмі ў гэтага дзіцяці зубішча*», трэба было шаптаць перад адчыненай печчу [4, с. 13]. Тут мы маем справу з выкарыстаннем агульнаславянскага мацярынскага сімвала – печы.

Яшчэ адной хваробай немаўлят лічылася так званая *«шчацінка»*. «Шчацінка» на спіне дзіцяці з'яўляецца, на думку сялянак, калі цяжарная жанчына пхне нагой хатнюю жывёлу. Тады дзіця пачынае плакаць і круціцца і не можа спаць на спіне. Лячылі «шчацінку» наступным чынам: на матчыным малацэ замешвалі невялікі кавалак цеста і качалі яго па спіне дзіцяці [2, с. 7], або клалі дзіця на тое месца, дзе ляжаў кот ці сабака і качалі яго [3, с. 5]. Кан'юктывіты і нагнаенні вачэй лячылі зацэжваючы вочкі немаўляці матчыным малаком [2, с. 7].

Досыць распаўсюджанай хваробай была «*малочніца*» (назва «*падбела*» зафіксавана ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці, «*шчэміны*» – у Мядзельскім



раёне Мінскай вобласці) – белы налёт на языку, дзяснах, вуснах дзіцяці. У Мядзельскім раёне Мінскай вобласці налёт выцiралі валасамі маці [2, с. 6].

Да цяперашняга часу вельмі распаўсюджаным захворваннем дзіцяці з'яўляюцца апрэласці. Лячэнне гэтай хваробы цесна звязана з працэдурай купання. Пасля купання перад тым, як спавіць дзіця, у паху і пад пахамі перасыпалі крухмалам ці пылком дзеразы, якую збіралі ў лесе [1, с. 23]. У Мядзельскім раёне Мінскай вобласці маці палівала папараныя месцы халоднай вадой з рота або засыпала так званай «*чарваточынай*» (пылком дравеснага чарвяка) [2, с. 5].

Існавалі яшчэ дзве групы хвароб, якія часам атаясамліваліся, і спосабы іх лячэння былі практычна аднолькавымі – *гэта* «*урокі*» («*зглаз*», «*пярэпалахі*», «спалох», «лякі») і *«начніцы» («крыксы», «плаксы»)*. Як адзначае В. Н. Харузіна, сяляне лічылі, што «ўзварушыць ці сурочыць душу чалавека» можна «дурным вокам» або здзіўленнем *(«падзіў»)* [9, с. 285]. Даследчыца І. В. Казакова адзначае, што для таго, «каб засцерагчы дзіця ад «дурных вачэй», маці псавала адзенне на маленькім дзіцяці» [7, с. 90]. Як адзначае П. В. Шэйн, найбольш распаўсюджанымі сродкамі лячэння урокаў з'яўляюцца наступныя: прыём прапускання дзіцяці паміж целам і кашуляй маці або праз бацькавы нагавіцы, выціранне падолам, «высмоктванне» маці ў вобласці вачэй і сэрца дзіцяці [10, с. 286–288]. Апытаныя намі рэспандэнткі распавядалі аб такім сродку лячэння ад урокаў, як *«выкачванне»* – па жывоціку сурочанага дзіцяці бабка вадзіла кавалкам цеста, замешанага на мацярынскім малацэ або хлеба і шаптала замову [3, с. 5]. Напрыклад, у Крупскім раёне Мінскай вобласці шапталі наступную замову:

На сінім морушку,
На белым камушку
Сядзелі тры бабушкі.
Шылі, вышывалі
І ад суроцы помачы давалі [6, с. 267].

Часам сурок мог спрычыніць начніцы, прыкметамі якіх сяляне лічылі вялікі жывоцік, начныя плачы і бяссонніцу. А. Я. Багдановіч апісвае цікавы абрад лячэння начніцаў – «паланне» дзіцяці: маці кладзе дзіця ў прыпол і некалькі разоў качае яго перад полымем печы, гаворачы пры гэтым паступную замову:

Цёмная ночка
Начніц парадзіла, –
Малому дзіцяці
Мукі нарабіла.
Яснае сонейка
Дзень пачынаець,
Начніц праганяець,
Дзянніц насылаець,
Боль сунімаець.
Шух у печ! Шух у печ! [5, с. 16].



Адна з рэспандэнтак так апісвала працэс лячэння начніцаў у яе дачкі: «Бабка ўзяла засланку ад печы, пасеяла на яе попел праз рэшата і паставіла дзіця на яго ножкамі, са слядкоў узяла попел і скатала яго ў тры галушачкі, а потым качала іх па жывату дачкі, шэпчучы замову» [3, с. 10]. А. Л. Тапаркоў, аналізуючы звычай рытуальных перапёкаў дзяцей ва ўсходнеславянскай традыцыі адзначае, што звяртанне дзіцяці ў печ сімвалізуе зварот дзіця ў матчыну ўтробу і новае нараджэнне [8, с. 115]. Так, прыведзеныя магічныя спосабы лячэння гэтай групы хвароб таксама адбывалася пры дапамозе агульнага для ўсходніх славян мацярынскага сімвала – печы.

Такім чынам, сацыяльная роля дзіцяці-«анёлка» (узрост ад нараджэння да 2–3 год) не асэнсоўвалася асобна ад маці. Аб гэтым сведчыць той факт, што многія хваробы, звязаныя з асаблівасцямі развіцця дзіцячага арганізма, «лячыліся» пры дапамозе малака маці («зубішча», «шчацінка»), матчыных валасоў («шчэміны»), вады з матчынага роту (апрэласці). Вялікая дзіцячая смяротнасць спрыяла ўяўленню сялян аб сацыяльнай «нетрываласці» дзіцяці ў «гэтым» свеце, вялікай верагоднасці яго вяртання ў «іншы» свет, што пацвярджае лячэнне некаторых хвароб пры дапамозе мацярынскага сімвала – печы («запекванне сухотаў», сімвалічныя «перапёкі» дзіцяці, «паланне»).

## ЛІТАРАТУРА

1. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАНБ. – Фонд 6. – Воп. 14. – С. 137.
2. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАНБ. – Фонд 6. – Воп. 14. – С. 138.
3. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАНБ. – Фонд 6. – Воп. 14. – С. 139.
4. Бабуля так лячыла...: замовы ад хвароб / склад. Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 53 с.
5. *Богданович, А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов: этнографический очерк / А. Е. Богданович. – Минск : Беларусь, 1995. – 186 с.
6. Замовы / уклад. Г. А. Барташэвіч; рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 595 с.
7. *Казакова, І. В.* Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І. В. Казакова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 151 с.
8. *Топорков, А. Л.* «Перепекание» детей в ритуалах и сказках восточных славян / А. Л. Топорков // Фольклор и этнографическая действительность: сб. ст.; ответ. ред. А. К. Байбурин. – Спб. : Наука, 1992. – 202 с. – С. 114–118.
9. *Харузина, В. Н.* Об участии детей в религиозно-обрядовой жизни / В. Н. Харузина // Этнографическое обозрение. – 1911. – № 1–2. – С. 1–78.
10. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. – Т. 3. Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени; игры, верования, обычное право; чародейство, колдовство, знахарство, лечение болезней, средства от ненастий, поверья, суеверья, приметы. – Спб. : Тип. Императорской Академии наук, 1902. – 535 с.